# *Маніфест па* адукацыі дарослых *у XXI стагоддзі*

EUROPEAN ASSOCIATION FOR THE EDUCATION OF ADULTS

ЕЎРАПЕЙСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ



# Сіла і радасць навучання

З дапамогай дадзенага маніфеста Еўрапейская асацыяцыя адукацыі дарослых (ЕАЕА) прапануе стварыць «Еўропу, якая навучаецца» – Еўропу, здольную паспяхова справіцца з выклікамі будучыні, выкарыстоўваючы ўсе неабходныя навыкі, веды і кампетэнцыі. Жыхарам Еўропы мы прапануем прычыніцца да развіцця грамадства, заснаванага на ведах і здольнага супрацьстаяць выклікам сучаснасці. Гэта, у сваю чаргу, патрабуе надзейных укладанняў у адукацыю дарослых на еўрапейскім, нацыянальным, рэгіянальным і мясцовым узроўнях. Бясспрэчна, у доўгатэрміновай перспектыве такія інвестыцыі змогуць сябе апраўдаць: павысіцца ўзровень канкурэнтаздольнасці, дабрабыту, здароўя нацый, павялічацца тэмпы эканамічнага росту і інш.

Адукацыя дарослых здольная змяніць жыццё і трансфармаваць грамадства. Права на адукацыю з'яўляецца фундаментальным правам чалавека і агульнай карысцю. Сёння асноўнай еўрапейскай палітычнай стратэгіяй з'яўляецца Еўрапейскі план дзеянняў па адукацыі дарослых, што рэалізуецца нацыянальнымі каардынатарамі дзяржаў-членаў ЕС. ЕАЕА выступае за ўзмацненне гэтага праграмнага дакумента і падкрэслівае неабходнасць дадатковых мер у накірунку развіцця сферы адукацыі дарослых. У дадзеным маніфесце даводзіцца, якім чынам адукацыя дарослых можа садзейнічаць рэалізацыі накірункаў еўрапейскай палітыкі ў розных сферах. Тым не менш, каб гэта стала магчымым, патрэбны істотныя грамадскія інвестыцыі ў адукацыю дарослых і ў тых, хто навучаецца.

Шмат хто з палітыкаў, асобы, адказныя за прыняцце рашэнняў, і грамадзяне не ўсведамляюць, у якой ступені адукацыя дарослых можа быць карыснай для вырашэння грамадскіх, эканамічных і асабістых праблем. Менавіта таму ЕАЕА прапануе правесці Еўрапейскі год адукацыі дарослых, што дазволіць павысіць дасведчанасць пра гэту сферу ў Еўропе.
Тэматычным фокусам можа стаць «Сіла і радасць навучання». З аднаго боку, мы імкнемся расказаць пра трансфармацыйныя магчымасці адукацыі дарослых, з другога – падкрэсліць пазітыўнае ўздзеянне навучання. Шмат людзей насцярожана ставяцца да навучання з-за няўдалага школьнага досведу, іншыя лічаць навучанне цяжкай ношай на шляху дасягнення поспеху ў жыцці. ЕАЕА імкнецца падкрэсліць станоўчыя аспекты адукацыі дарослых галоўным чынам таму, што мы ведаем – гэта і ёсць найлепшы спосаб прыцягнуць да навучання тых, хто ад яе далёкі.



# Цяжкасці і іх пераадоленне

Адукацыя дарослых з'яўляецца галоўным інструментам у супрацьстаянні выклікам, з якімі сутыкаецца Еўропа сёння. Усё часцей назіраюцца выпадкі няроўнасці не толькі паміж людзьмі, але і паміж рэгіёнамі і краінамі Еўропы. Узнікае адчуванне, што ўсё болей і болей еўрапейцаў ставяць пад сумніў еўрапейскія каштоўнасці, галасуючы за партыі з радыкальнымі і антыеўрапейскімі поглядамі, у сваю чаргу групы маладых людзей становяцца настолькі радыкалізаванымі, што здзяйсняюць акты тэрору. Шмат у якіх краінах узровень беспрацоўя (асабліва сярод моладзі) вельмі высокі. Усё больш шырокае выкарыстанне лічбавых тэхналогій не толькі ўскладняе гэту сітуацыю, але і патрабуе ад працаўнікоў, грамадзян і спажыўцоў новых навыкаў і ўменняў.

Міграцыйная і дэмаграфічная сітуацыя ў Еўропе цягне за сабой змены ў складзе насельніцтва: працягласць жыцця людзей павялічваецца, яны хочуць быць актыўнымі і здаровымі больш доўга, грамадству ўсё яшчэ патрэбны мігранты – усё гэта знаходзіцца ў кволай раўнавазе з-за беспрацоўя, якое ўвесь час расце, і ксенафобіі. Нядаўна ў Еўропу рынулася хваля бежанцаў, што паставіла перад еўрапейскімі ўрадамі вельмі складаныя задачы. Гэтыя падзеі выклікалі неадназначную рэакцыю сярод еўрапейскіх грамадзян: некаторыя выступілі ў абарону бежанцаў, іншыя праяўлялі гвалт і нянавісць.

Змяненне клімату і экалагічныя праблемы працягваюць ствараць пагрозу для будучыні еўрапейскіх краін (і не толькі), указвачы на неабходнасць вядзення больш устойлівай эканомікі і разумнага ладу жыцця. Адукацыя дарослых можа прапанаваць спосабы вырашэння многіх названых праблем, прыносячы карысць як асобным удзельнікам, так і грамадству і эканоміцы ў цэлым.

Ці патрэбна нам інавацыйная, роўная, устойлівая Еўропа, у жыцці якой актыўна ўдзельнічаюць грамадзяне, кіруючыся дэмакратычнымі прынцыпамі? Еўропу, дзе ў людзей ёсць навыкі і веды, як жыць прадуктыўна і заставацца здаровымі, прымаючы ўдзел у грамадскім жыцці з ранняга ўзросту і да самай старасці?

У гэтай публікацыі EAEA прадстаўляе аргументы, вынікі даследаванняў, прыклады і досвед навучэнцаў, што наглядна адлюстроўвае нашу пазіцыю.

# Актыўная грамадзянскасць, дэмакратыя і ўдзел

ЕАЕА і яе сябры выступаюць за глыбокую прыхільнасць Еўропе і еўрапейскім каштоўнасцям. На нашу думку, міжкультурны абмен і ўзаемадзеянне з'яўляюцца галоўнымі інструментамі ў стварэнні Еўропы, поўнай павагі, яднання і ўдзелу.

Шмат якія арганізацыі, якія займаюцца адукацыяй дарослых, былі заснаваны ў выніку дзейнасці вызваленчых рухаў (працоўных, жанчын, рэлігійных арганізацый і г.д.). Адукацыя дарослых працягвае прадастаўляць веды і ноу-хау, а таксама прастору для развіцця дэмакратыі і грамадзянскасці. Акрамя таго, адукацыя дарослых здольная ўмацаваць і актывізаваць грамадзянскую супольнасць.

Радыкалізацыя Еўропы, якая расце, паказала, што неабходна ўмацоўваць талерантныя, дэмакратычныя і паважлівыя адносіны ў грамадстве. Міжкультурны і міжканфесійны дыялог можа адыграць значную ролю ў паляпшэнні дадзенай сітуацыі.

Акрамя ўсяго іншага, адукацыя дарослых здольная садзейнічаць развіццю дэмакратыі і грамадзянскасці на нацыянальным і рэгіянальным узроўнях, забяспечваць празрыстасць і ўмацаванне актыўнай грамадзянскай супольнасці, а таксама рабіць свой унёсак у развіццё навыкаў крытычнага мыслення і пашырэнне правоў і магчымасцяў грамадзян.

Па выніках даследавання PIAAC[1], існуе відавочная ўзаемасувязь паміж «даверам» і «палітычнай эфектыўнасцю» ў залежнасці ад развіцця навыкаў. Чым меньш развітыя базавыя навыкі чалавека, тым менш яго давер да розных інстытутаў і тым менш яго вера ў тое, што ён можа аказваць уплыў на нешта. Людзі, уцягнутыя ў адукацыю дарослых, таксама нашмат часцей выступаюць у якасці валанцёраў.

---

www.oecd.org/site/piaac/surveyofadultskills.htm

## Паспяховыя практыкі

Румынскі праект «Citizens First» (бел. – Спачатку грамадзяне) прывёў да ўстойлівых, маштабных зменаў у малых населеных пунктах па ўсёй краіне, асабліва ў сельскай мясцовасці. Праект накіраваны на развіццё грамадзянскасці: людзі вучацца выказваць свае думкі пра тое, што ў першую чаргу важна для іх населенага пункта, а праект прадастаўляе ім інструменты пошуку рашэнняў, якія яны самі могуць выкарыстоўваць. Удзельнікі праекта сумесна выдзяляюць праблемы сваёй супольнасці, галасуюць за тыя з іх, што будуць вырашацца ў першую чаргу і сумеснымі намаганнямі распрацоўваюць праграмныя планы. Гэты праект выйшаў за рамкі простай рэалізацыі праграмных планаў. Адбылося замяненне свядомасці і адносінаў грамадзян да ўлады: чыноўнікі перасталі ўспрымацца выключна як асобы, прымаючыя рашэнні, цяпер яны – роўныя партнёры на шляху развіцця. Сёння пытанне гучыць так: «Што трэба зрабіць і што з гэтага мы можам зрабіць самі для сябе і для нашай супольнасці?»

## Пацверджана даследаваннямі

Гаворачы пра ўмацаванне сацыяльнай згуртаванасці, трэба адзначыць, што галоўны ўнёсак адукацыі – фармаванне даверу, умацаванне супрацоўніцтва ў рамках грамадзянскай супольнасці, а таксама зніжэнне ўзроўню злачыннасці і гвалту. Акрамя таго, уцягнутасць асобы ва ўласную адукацыю з большай доляй верагоднасці прывядзе да актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, таму што «чым больш навучэнцы ўцягнуты ў сваю адукацыю, тым больш яны зацікаўлены адыгрываць значную ролю ў грамадскім жыцці» (стар.20). Больш за тое, дзякуючы адукацыі дарослых навучэнцы становяцца больш цярпімымі да прадстаўнікоў іншых рас і культур, а таксама больш актыўнымі выбаршчыкамі. Прэстан (2004) прааналізаваў уплыў адукацыі дарослых на грамадзянскасць удзельнікаў даследавання і на фармаванне каштоўнасцяў, у прыватнасці, цярпімасці. Ён выявіў, што навучанне можа аказваць уплыў на нефармальныя і афіцыйна ўстаноўленыя формы грамадскага ўдзелу. Што тычыцца нефармальных спосабаў грамадскага ўдзелу, навучанне дапамагае людзям фармаваць, падтрымліваць, спыняць, перабудоўваць і ўзбагачаць свае сацыяльныя сувязі.

Разам з тым, навучанне можа мець станоўчы ўплыў на фармаванне каштоўнасцяў. Напрыклад, рэспандэнтамі адзначалася змяненне ўзроўню цярпімасці, разумення і павагі. Сацыяльная і грамадзянская актыўнасць у якасці выніку адукацыі аналізаваліся Арганізацыяй эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР) у 2007 г.

Больш падрабязна тут: *www.eaea.org/media/policy-advocacy/piaac/piaac-analysis_wakeup-call-for-europe.pdf*

## Паспяховыя практыкі

Даследчыцкая асацыяцыя шведаў-мусульман «Ibn Rushd» рэалізавала праект у галіне культуры міру «Att främja islamisk freds- kultur» (Распаўсюджванне ідэй мірнай ісламскай культуры), у рамках якога маладыя мусульмане па ўсёй краіне ўзялі на сябе ролю «праваднікоў міру». Удзельнікі праекта атрымалі веды і навыкі ў галіне культуры міру, правоў чалавека і супрацьдзеяння гвалту. Доўгатэрміновай мэтай праекта стала выкараненне ісламафобіі – страху і варожасці ў адносінах да ісламу, якія часта назіраюцца на Захадзе, і наадварот – страху і варожасці ў адносінах да Захаду, якія могуць пераносіць мусульмане. Быў таксама закладзены падмурак для стварэння арганізацыі Мірнага руху мусульман «Svenska muslimer för fred och rättvisa» (Шведы-мусульмане за мір і справядлівасць).

# Навыкі, неабходныя для жыцця

Людзям важныя не толькі непасрэдныя вынікі ад навучання: даследаванні сведчаць пра тое, што ўдзел у нефармальнай адукацыі дае дарослым навучэнцам і іншыя перавагі.

Адукацыя дарослых здольная змяніць жыццё і адкрыць новыя магчымасці: паляпшэнне шансаў на працаўладкаванне, навучанне ў фармальнай сістэме адукацыі, вяртанне ў адукацыйны працэс людзей з няпоўнай школьнай адукацыяй, дапамога бацькам з іх задачамі, раскрыццё мастацкага і культурнага патэнцыялу чалавека, а таксама вядзенне больш здаровага ладу жыцця.

## Пацверджана даследаваннямі

Згодна з даследаваннямі, дарослыя навучэнцы атрымліваюць самую розную карысць ад нефармальнай адукацыі дарослых. Яны адчуваюць сябе больш здаровымі і прытрымліваюцца больш здаровага ладу жыцця; будуюць новыя сацыяльныя сувязі і маюць больш высокі ўзровень дабрабыту. Больш за тое, дарослыя навучэнцы маюць больш высокую матывацыю ўдзелу ў непарарыўнай адукацыі і ўспрымаюць яе як выдатную магчымасць палепшыць якасць свайго жыцця. Гэтыя вынікі паведамлялі навучэнцы ўсіх адукацыйных накірункаў, пачынаючы з вывучэння моў і мастацтва да заняткаў спортам і грамадзянскай адукацыі. […] Адукацыя дарослых становіцца асабліва карыснай для людзей з нізкім узроўнем адукацыі (МСКО 1: 32% и МСКО 2: 22 %)

Больш падрабязна тут: *www.bell-project.eu*

## Паспяховыя практыкі

Мэл з Вялікабрытаніі пакутавала ад агарафобіі на працягу трынаццаці гадоў; у верасні 2007 года яна набралася смеласці і запісалася на заняткі па развіцці пісьменнасці. Нягледзячы на трывогу, яна стала наведваць заняткі і заўважыла, што раз ад разу ёй давалася гэта лягчэй. Мэл наведвала заняткі ў цэнтры адукацыі дарослых Хал, дасягнуўшы 3-га пачатковага ўзроўню пісьменнасці 3, а таксама наступных 1-га і 2-га ўзроўняў. Яна таксама дасягнула і наступнай сваёй мэты – прайсці першы ўзровень арыфметычнай адукаванасці.

Мэл таксама хацела дапамагаць іншым, таму скончыла навучальны курс для валанцёраў і пачала падпрацоўваць на занятках для дарослых з абмежаванымі магчымасцямі і цяжкасцямі ў навучанні. Захацеўшы стаць выкладчыкам-кансультантам, Мэл прайшла курс па падтрымцы навучэнцаў і зараз працягвае сваё навучанне па падрыхтоўцы да выкладання на курсах непарарыўнай адукацыі, які плануе завяршыць у хуткім часе. Зараз Мэл верыць у сябе, с задавальненнем бавіць час з сям'ёй, скінула каля 40 кг і акрамя вучобы працуе ў якасці валанцёра ў дабрачыннай установе  Dove House.

«Зараз мяне ўжо нішто не спыніць. У мяне не было нічога, а цяпер у мяне ёсць новае жыццё, і ўсё дзякуючы таму, што я зноў пачала вучыцца», – усміхаецца Мэл.

Больш падрабязна тут: *www.alw.org.uk/winners-stories/winner-story/2011/melanie-turner*

# Сацыяльнае адзінства, роўнасць і справядлівасць

Узровень адукацыі аказвае моцны ўплыў на магчымасці чалавека: ад прафесіі, якую ён можа атрымаць, да працягласці жыцця. Станоўчыя эфекты навучання звычайна здараюцца дзякуючы таму факту, што людзі з больш высокім узроўнем адукацыі імкнуцца працягваць навучанне, і ім прадастаўляецца больш магчымасцяў для гэтага, чым тым, у каго ўзровень адукацыі ніжэйшы.

Адукацыя дарослых можа кампенсаваць недахоп адукацыі ў раннім узросце і даць чалавеку магчымасць быць сацыяльна больш мабільным: ад развіцця базавых навыкаў да другога шансу атрымаць базавую адукацыю і прайсці моўныя курсы для мігрантаў. Адукацыя дарослых не толькі дае ўдзельнікам мноства магчымасцяў змяніць жыццё, але і раўнуе грамадства ў цэлым праз стварэнне больш справядлівых грамадскіх асноў, а таксама садзейнічае эканамічнаму росту.

Уцягванне групаў насельніцтва, якія не ўдзельнічаюць у адукацыі, неабходна для дасягнення больш шырокай сацыяльнай уключанасці. Выкарыстоўваючы правільныя метады і падыходы, можна забяспечыць высокую грамадскую актыўнасць сярод грамадзян: у пытаннях дэмакратыі, эканомікі, мастацтва і культуры.

## Паспяховыя практыкі

У цэнтры адукацыі дарослых «La Verneda – Sant Marti» прывітанне з людзьмі, што ўпершыню наведваюць заняткі, з'яўляецца важным заданнем, якое павінен выканаць кожны. Час выдзяляецца для кожнага, хто прыходзіць вучыцца ў цэнтр. Навучэнцы старэйшых курсаў адыгрываюць важную ролю ў прыёме, рэгістрацыі і размеркаванні новых удзельнікаў па групах, бо ў іх ужо ёсць досвед быць навічкамі, і яны разумеюць, што трэба новым студэнтам. Размеркаванне па ўзроўнях навучання засноўваецца на дыялогу са студэнтам і пагадненні бакоў. Асобая ўвага надаецца таму, каб кожны разумеў сутнасць навучання ў цэнтры і быў размеркаваны ў адпаведную і найбольш прыдатную для яго вучэбную групу. Супрацоўнікі цэнтра і валанцёры стараюцца дзейнічаць так, каб у новых студэнтаў не было адчування, што іх тэстуюць.

## Паспяховыя практыкі

Матывуючыя навучанне курсы народных школ, якія стымулююць маладых людзей, шукаючых працу, працягваць адукацыю, вельмі добра сябе зарэкамендавалі ў Швецыі. Па заканчэнні каля 40% студэнтаў гэтых курсаў працягнулі вучобу альбо працу, больш за дзве трэці павысілі сваю матывацыю навучання і прыйшлі да высновы, што адукацыя з'яўляецца важным этапам на шляху да паспяховай кар'еры.

Ва ўсіх рэгіёнах Швецыі праводзяцца спецыяльныя курсы народных школ для больш паспяховай інтэграцыі імігрантаў, а таксама адукацыйныя гурткі для бежанцаў, якія плануюць застацца ў краіне.

Такія паспяховыя практыкі сталі магчымымі, дзякуючы існуючым кампетэнцыям і інфраструктуры нацыянальнай сістэмы адукацыі дарослых, дзе ўстановы на рэгулярнай аснове атрымліваюць дзяржаўнае фінансаванне. Гэта прыклад устойлівай мадэлі адукацыі дарослых, гнуткай для адаптацыі да новых патрэбаў і выклікаў у грамадстве.

# Занятасць і выкарыстанне лічбавых тэхналогій

Ваноўчая ўзаемасувязь паміж занятасцю і навучаннем відавочная: супрацоўнікі, якія навучаюцца, адыгрываюць важную ролю, бо дзякуючы ім у кампаніі развіваюцца інавацыі і прадукцыйнасць, павышаецца канкурэнтаздольнасць і прадпрымальніцкая ініцыятыва. Навучанне на працоўным месцы з'яўляецца адным з асноўных фактараў, матывуючых работнікаў прымаць удзел у неперарыўнай адукацыі, а супрацоўніцтва паміж асноўнымі ўдзельнікамі, асабліва сацыяльнымі партнёрамі, вельмі важна. Хаця ЕАЕА падзяляе ідэю важнасці павышэння ўзроўню ведаў і перакваліфікацыі, трэба таксама падкрэсліць, што любое навучанне становча сказваецца на занятасці.

ЕАЕА прытрымліваецца падыходу да навучання, які садзейнічае развіццю базавых навыкаў і навыкаў шырокага прымянення. Прытрымліваючыся выключна тэхнічнага падыходу, можна обмежавацца выпрацоўкай навыкаў, якія ў хуткім часе састарэюць. Аднак, калі развіваць здольнасці вучыцца, выкарыстоўваць інавацыі і прадпрымальніцкую ініцыятыву, стымуляваць больш змястоўны падыход да прадмета і вынікаў навучання, можна на выхадзе атрымаць навучэнцаў, здольных камбінаваць метады інфармальнага, нефармальнага і фармальнага навучання і не дазваляць сваім ведам і навыкам станавіцца састарэлымі.

Прагнозы яўна дэманструюць, што ў Еўропе патрэба ў ведах будзе ўзрастаць, а нізкакваліфікаваных работнікаў неабходна будзе ўсё меней. Найбольш яркае таму пацвярджэнне – выкарыстанне лічбавых тэхналогій. Мы стаім на парозе вялікіх перамен: электронны ўрад, анлайн-шопінг, аўтаматызацыя і іншыя змены, звязаныя з развіццём інтэрнета. Гэта азначае, што мы павінны забяспечыць лічбавую адукаванасць, даць магчымасць кожнаму стаць упэўненым карыстальнікам не толькі кампутара, планшэта ці смартфона, але і іншых інфармацыйных інструментаў. Ужо зараз можна меркаваць пра тое, што будзе захоўвацца тэндэнцыя знікнення прафесій, якія ўстарэлі, і ўзнікнення новых. Еўропа будзе мець патрэбу ў высокакваліфікаваных работніках, здольных хутка адаптавацца да зменаў. Развіваць гэты навык можна дзякуючы навучанню. Многія паслугі дзяржаўных службаў і інструменты грамадзянскага ўдзелу ўжо даступныя ў інтэрнеце. Лічбавая адукаванасць гарантуе лічбавую інклюзію і магчымасць удзелу ў рознага кшталту дзеяннях.

Больш за тое, радыкальныя змены дойдуць і да сферы паслугаў: колькасць і частата непасрэднага кантакту людзей паміж сабой будзе скарачацца. Гэтыя ж змены закрануць і сферу дыстанцыйнага навучання, якая адкрывае шырокія магчымасці, але ў той жа час зніжае значнасць сацыяльнага ўзаемадзеяння, важнага для многіх навучэнцаў. Адукацыя дарослых можа прапанаваць пляцоўкі для такога ўзаемадзеяння, што з'яўляецца надзвычай значным для паспяховасці, псіхічнага здароўя, салідарнасці і сацыяльнага адзінства, неабходных Еўропе.

## Пацверджана даследаваннямі

Згодна з даследаваннем «BeLL» («Benefits of Life-long Learning» – бел. «Перавагі неперарыўнай адукацыі»), удзел у нефармальнай адукацыі дае дарослым навучэнцам нямала перавагаў, якія даволі часта аказваюць уплыў на непасрэднае акружэнне чалавека: яго сям'ю, калегаў і іншыя сацыяльныя сувязі. Такім чынам, адукацыя дарослых станоўча ўплывае на грамадства ў цэлым. 70-87% з 8646 рэспандэнтаў адзначылі пазітыўныя змены ў матывацыі вучыцца, сацыяльным узаемадзеянні, агульнай паспяховасці і задаволенасці жыццём. Радзей адзначаліся змены, якія тычацца працы, кар'еры, актыўнай грамадзянскай пазіцыі, аднак нават у гэтых сферах каля 31-42 % апытаных бачылі станоўчыя змяненні.

Больш падрабязна тут: *www.bell-project.eu/cms/wp-content/uploads/2014/06/BeLL-Survey-results.pdf,* стар. 122

# Міграцыя і дэмаграфічныя змены

Адукацыя дарослых можа адыгрываць вельмі важную ролю ў вырашэнні сённяшняга міграцыйнага крызісу ў Еўропе. Прынцыпы гасціннасці і актыўнай грамадзянскай пазіцыі садзейнічаюць стварэнню сярод дзяржаў-членаў ЕС культуры, адкрытай да інтэграцыі. З дапамогай моўных курсаў і курсаў базавых навыкаў для мігрантаў будуць створаны ўмовы для максімальна паспяховай інтэграцыі ў новай краіне.

Выкарыстанне метадаў і падыходаў міжкультурнага дыялогу дасць магчымасць абмену досведам паміж карэннымі і новымі грамадзянамі дзяржаў-членаў, дазваляючы мігрантам лепш зразумець культуру і сацыяльныя асновы новай краіны, а грамадзянам прымаючага боку – засвоіць новыя звычкі, паступова трансфармуючы сваю краіну ў дэмакратыю, арыентаваную на будучыню. У доўгатэрміновай перспектыве Еўропе будуць патрэбны гэтыя і іншыя мігранты, каб справіцца з дэмаграфічнымі зменамі. Што тычыцца дэмаграфічных зменаў, актыўнае старэнне магчыма толькі пры наяўнасці адукацыйных паслугаў для людзей «трэцяга ўзросту». Даследаванні паказваюць, што студэнты «трэцяга ўзросту» больш актыўныя, часцей выступаюць у якасці валанцёраў, даўжэй працуюць і застаюцца здаровымі. Такім чынам, сталыя грамадзяне, якія навучаюцца, з'яўляюцца рашэннем дэмаграфічнага крызісу – больш за тое, яны прыносяць сапраўдную карысць еўрапейскім дэмакратыям.

Адукацыйны працэс, у якім удзельнічаюць людзі розных пакаленняў, дазваляе навучэнцам узяць з ведаў адно аднаго нешта каштоўнае і карыснае для сябе; дзякуючы сумесным намаганням можна ўмацаваць салідарнасць паміж прадстаўнікамі ўсіх узроставых групаў еўрапейскіх краін, такім чынам садзейнічаючы вядзенню дэмакратычнага дыялогу, які так неабходны ў перыяд крызісу.

## Паспяховыя практыкі

Фаціма прыбыла ў Ірландыю ў лістападзе 2013 года разам з маці і двума братамі. Яна родам з Афганістана, праз Іран трапіла ў Сірыю і пражыла там тры гады. Перабраўшыся ў Ірландыю, сям'я спачатку тры месяцы пражыла ў Дубліне, а потым пераехала ў Таламор. Зараз Фаціма мае статус бежанца. Дэпартамент па пытаннях правасуддзя даў ёй магчымасць прайсці моўныя курсы. Гэтыя курсы, на яе думку, былі трохі ізаляванымі, у той час як ёй хацелася лепш інтэгравацца ў ірландскае грамадства. Менавіта тады ёй расказалі пра магчымасці прайсці курсы прафесійнага навучання, і яна ўжо скончыла свой першы год навучання. Курсы разлічаны на два гады, і хоць звычайна студэнты праходзяць адзін пачатковы курс у першы год навучання, а выпускны – у другі, Фаціма здолела прайсці два курсы па фізіцы і хіміі за адзін год. Падтрымаў яе ў гэтым Таламорскі цэнтр дадатковай адукацыі. Дзякуючы таксама прапанавалі магчымасць наведваць тэхналагічны інстытут Атлон для адпрацоўкі атрыманых ведаў на практыцы. Фаціма ставіць перад сабой высокія мэты, выдатна валодае ангельскай мовай, мае вялікія надзеі на будучыню, і яна ўдзячна за моцную падтрымку ў навучанні, што аказаў ёй Савет па пытаннях адукацыі і прафесійнага навучання «Laois and Offaly ETB».

# Устойлівасць

Дасягненне ўстойлівасці ва ўсіх сферах становіцца сапраўдным выклікам для еўрапейцаў: ад экалагічнага спажывання да энергаэфектыўнасці. Грамадзянам Еўропы неабходна, з аднаго боку, валодаць вялікай колькасцю інфармацыі, а з другога – мець прастору для ўкаранення інавацый з мэтай фармавання новых жыццёвых падыходаў і прынцыпаў. Адукацыя дарослых можа садзейнічаць прадастаўленню неабходнай інфармацыі, прасторы для творчасці і пляцоўкі для дыскусій.

Адукацыя дарослых з'яўляецца рухавіком ва ўзаемадзеянні трох кампанентаў устойлівага развіцця (эканамічнага, сацыяльнага і экалагічнага) і можа садзейнічаць дасягненню мэтаў ААН у рамках Плана дзеянняў 2030. Існуе рэальная неабходнасць у адукацыі па пытаннях устойлівага развіцця, дзе важную ролю адыгрывае менавіта нефармальная адукацыя.

Адукацыя дарослых можа зрабіць вялізны ўклад у дасягненне мэтаў Лісабонскага плана для ўстойлівага, разумнага і інклюзіўнага росту, а таксама праграмы Прэзідэнта Еўрапейскай камісіі Жана-Клода Юнкера. Да таго ж адукацыя дарослых можа садзейнічаць павышэнню ўзроўня занятасці, паскорыць эканамічны рост, дапамагаць стварэнню адзінага лічбавага рынку. Падтрымліваючы прынцыпы ўстойлівага развіцця, адукацыя дарослых можа спрыяць рабоце энергетычнага саюза і выкананню задач прагрэсіўнай палітыкі па пытаннях змянення клімату. Адукацыя дарослых здольна дзейнічаць на ўмацаванне еўрапейскіх каштоўнасцяў , а таксама адзінага рынку, напрыклад, прадастаўляючы магчымасці выпрацоўкі навыкаў для свабоднага перамяшчэння працоўнай сілы.

## Пацверджана даследаваннямі

Адукацыя дарослых адыгрывае галоўную ролю ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця. Пілотны курс […] абапіраецца на скандынаўскую традыцыю фармавання грамадзянскасці ”folkeopplysning”. […] Мэтавыя групы, з якімі працуюць студэнты, складаюцца з дарослых навучэнцаў, сярод якіх – мясцовыя грамадзяне і школьныя выкладчыкі. Тэматычны ахоп праектаў у рамках курса наступны:

- устойлівыя будынкі і матэрыялы;
- устойлівыя прадукты харчавання;
- наладжванне партнёрства паміж прадстаўнікамі мясцовай улады, грамадзянскай супольнасці і камерцыйнага сектару: пошук спосабаў актывізаваць Мясцовы план дзеянняў 21;
- разпрацоўка сістэмы сертыфікавання па экалагічных прынцыпах і сістэмы ўстойлівага менеджмента;
- канцэпцыі этычнага спажывання і глабальнай грамадзянскасці.

## Пасняховыя практыкі

Аўстрыйскі кансультатыўны офіс па пытаннях навакольнага асяроддзя «Umweltberatung» распрацаваў спецыяльнае «пасведчанне энергаэфектыўнага карыстальніка». Гэтая распрацоўка служыць інструментам эканоміі электраэнергіі ў прыватнай гаспадарцы, на малых і сярэдніх прадпрыемствах, а таксама ў супольнасцях – і такім чынам забяспечвае ахову навакольнага асяроддзя і зберажэнне электраэнергіі. Энергаэфектыўнасць у паўсядзённым жыцці робіць свой унёсак у зніжэнне выдаткаў на электраэнергію, што мае асаблівую значнасць для людзей і хатніх гаспадарак, якія знаходзяцца на мяжы беднасці. Разумныя адносіны да электраэнергіі і развіццё энергаэфектыўных стратэгій паводзінаў – гэта, апроч усяго іншага, уклад у зніжэнне выдаткаў у цэлым, што садзейнічае выкараненню беднасці. Прытрымліванне прынцыпаў энергаэфектыўнасці на працоўным месцы садзейнічае павышэнню ўзроўню канкурэнтаздольнасці дзякуючы зніжэнню выдаткаў, а таксама стымулюе дасягненне ўстойлівасці ў быце.

Больш падрабязна тут: *www.umweltberatung.at/ueber-uns-international-and energie-fuehrerschein.at*

# Адукацыя дарослых і еўрапейская палітыка

Адукацыя дарослых робіць свой уклад у

- рэалізацыю еўрапейскіх стратэгій у галіне ўстойлівага, разумнага і інклюзіўнага росту;
- развіццё галоўных еўрапейскіх каштоўнасцяў, такіх як справядлівасць, сацыяльнае адзінства, актыўная грамадзянскасць, выкарыстанне творчых і інавацыйных падыходаў;
- зніжэнне ўзроўню беспрацоўя ў Еўропе праз вяртанне людзей у сістэму занятасці, пры дапамозе пацвярджэння наяўных навыкаў і кампетэнцый альбо павышэння кваліфікацыі;
- меры па зніжэнні колькасці людзей (80 мільёнаў чалавек), якія маюць недастатковы ўзровень базавых навыкаў і ўдзельнічаюць у праграмах неперарыўнай адукацыі радзей, чым больш адукаваныя грамадзяне: адукацыя дарослых сапраўды прымяняе на практыцы меры, накіраваныя на пашырэнне правоў і магчымасцяў дадзенай групы насельніцтва;
- дасягненне мэты ЕС па скарачэнні мінімум на 20 мільёнаў колькасці людзей, якія знаходзяцца на мяжы беднасці і сацыяльнага выключэння, разлічваючы на тое, што адукацыя дапамагае ім паверыць у свае ўласныя сілы, а таксама знайсці спосабы інтэграцыі ў супольнасці і ўладкавацца на працу (памяняць прафесію).

Ад стымулявання росту ўзроўню занятасці насельніцтва і эканамічнага развіцця да адзінага лічбавага рынку, ад прадухілення негатыўных наступстваў змянення клімату да садзейнічання паспяховаму функцыянаванню ўнутранага рынку, ад вырашэння праблем, звязаных з міграцыяй, да пераадолення цяжкасцяў глабальнага маштабу і дэмакратычных перамен адукацыя дарослых робіць свой унёсак у дасягненне мэтаў як еўрапейскага Плана дзеянняў 2020, так і праграмы Жана-Клода Юнкера. Акрамя таго, адукацыя дарослых з'яўляецца асноўным інструментам у дасягненні мэтаў ААН у рамках Плана дзеянняў 2030 і Мэтаў устойлівага развіцця ААН.

У імкненні да адзінай, квітнеючай, мірной Еўропы, здольнай паспяхова спраўляцца з выклікамі будучыні, найважнейшую ролю адыгрывае адукацыя дарослых.

**Выдавец:** Еўрапейская асацыяцыя адукацыі дарослых (EAEA)
**Тэкст:** Джына Эбнер (EAEA) пры падтрымцы членаў EAEA, Выканаўчага савета і Сакратарыята EAEA
**Пераклад:** Святлана Гаўдзіс
**Вёрстка:** Ксенія Карпечанка

Выдана пры фінансавай падтрымцы праекта Erasmus+ Еўрапейскага Саюза

Co-funded by the Erasmus+ Programme of the European Union

Падтрымка Еўрапейскай камісіяй выдання гэтай публікацыі не азначае згоды з яе зместам. У гэтым дакуменце адлюстраваны погляды аўтараў, Еўрапейская камісія не нясе адказнасці за любое выкарыстанне інфармацыі, якая тут утрымліваецца.

EUROPEAN ASSOCIATION FOR
THE EDUCATION OF ADULTS

ЕЎРАПЕЙСКАЯ АСАЦЫЯЦЫЯ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ

Mundo-J, Rue de l'Industrie 10, B-1000 Brussels
Tel. +32 2 893 25 22, eaea-office@eaea.org
www.eaea.org